## ЛІТАРАТУРА

1. *Казанина, В.* Аутентичность в антиквариате и декоративно-прикладном искусстве Беларуси / В. Казанина // Folklor, folkloryzm, folk : zbiór artykułów naukowych z I Konferencji «Folklor, folkloryzm, folk», która odbyła się w 2015 r. w Szczecinie / pod red. Bogdana Matławskiego. - Szczecin: WNUS, 2016. – С. 219 – 225.

## ТЭЗАЎРАВАННЕ Ў ВЫВУЧЭННІ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ

**Тэзаўраванне ў вывучэнні народнай творчасці** (ад *ст.-грэч.* θησαυρός – скарб) – *навукова-аналітычны метад, заснаваны на размеркаванні ўзораў народнай творчасці па групах з пэўнай тыпалогіяй і аб'яднанні ў поўны звод (тэзаўрус).* Дакладна арганізаванае тэзаўраванне стварае аснову для планавання дзейнасці па вывучэнні і захаванні народнай творчасці ў інтарэсах асобных груп яе носьбітаў, аналітыкаў-навукоўцаў і грамадства цалкам. Фактычна па прынцыпах тэзаўравання былі заснаваныя такія айчынныя акадэмічныя фальклорныя зводы, як «Беларуская народная творчасць» (ІМЭФ НАН Беларусі) савецкай эпохі, «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» (ІПК МК Беларусі) часоў суверэнітэту Беларусі. Як прыклад тэзаўравання народнай творчасці ў эпоху інфармацыйнага грамадства можна прывесці інфармацыйны партал «Жывая спадчына Беларусі» (livingheritage.by), дзе, на падставе рэгіянальнага падыходу, даволі поўна прэзентуюцца тэхналогіі вырабу артэфактаў народнага мастацтва (панямонскага ткацтва, неглюбскага тэкстылю, дрыбінскага шапавальства), а таксама ўзоры фальклорнай творчасці, галоўная прыкмета якіх – жывое бытаванне ў побыце носьбітаў і захавальнікаў мастацкіх традыцый XXI стагоддзя.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Казанина, В.* Опыт тезаурирования ключевых проблем арт-рынка антикварных произведений искусства Республики Беларусь / В. Казанина // Вести Института современных знаний. – 2017. – №2 (71) . – С. 20 – 24.

## ФАЛЬКЛАРЫЗАЦЫЯ МАСТАЦКА-КУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ

**Фальклярызацыя мастацка-культурнай прасторы** - *упарадкаванне мастацка-культурнай прасторы краіны ў напрамку цэласнасці з улікам мясцовых традыцый, заснаваных на аўтахтонным этнамастацтве.* Сістэмная мэта творчасці – прывядзенне мастацка-культурнай прасторы краіны ў стан, які адказвае доўгачасовым патрэбам грамадства: стабільнаму самаўзнаўленню і развіццю ў мясцовым прыродным і культурным ландшафце. На генезіс айчыннай мастацка-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурнай прасторы ўплывалі: а) абумоўленасць артэфактаў яе этнамастацтва (з моцнымі фальклорнымі каранямі) асаблівасцямі перыядаў старажытнай гісторыі і геаграфічным становішчам Беларусі; б) далучанасць тэрыторыі Беларусі з часоў Сярэднявечча да ўсіх стадый развіцця еўрапейскага мастацтва, якая забяспечыла вялікую колькасць якасных артэфактаў прыгожых мастацтваў мясцовага паходжання. Паколькі сёння беларускі этнаскладнік у мастацка-культурнай прасторы прадстаўлены відавочна недастаткова, яе фальклярызацыя – патрэба часу.


ЛІТАРАТУРА

1. *Казанина, В.* Арт-рынок антикварных произведений искусства Беларуси как система: генезис и актуальные приоритеты формирования целостности / В. Казанина // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / нав. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск: Права і эканоміка, 2017. – Вып. 23. – С. 301 – 307.


## ЭТНАМАСТАЦКАЯ АДУКАЦЫЯ

**Этнамастацкая адукацыя** (ад *ст.-грэч.* ἔθνος – народ і *лац.* educatio – выхаванне) – *набыццё грамадска-карысных ведаў, уменняў і навыкаў сродкамі азнаямлення з узорамі народнага мастацтва свайго этнасу.* Пад уплывам фальклорнага руху канца XX стагоддзя ў Расіі, Украіне, Беларусі, Прыбалтыцы, Закаўказзі, Сярэдняй Азіі на мяжы XX – XXI стагоддзяў з'явіліся «народныя» аддзяленні ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, дзе матэрыяльнае і вуснае народнае мастацтва павінна была з'яўляцца мэтай і зместам навучання. У межах іх дзейнасці была ажыццяўлена спроба «вывесці селекцыйна» пераемнікаў народнага мастацтва этнасаў былога СССР. Праз акадэмічны абмен у Беларусі з'явіўся шэраг выкладчыкаў-народнікаў, у тым ліку Н. Лаўрухіна (народны танец) і Л. Снапкова (спевы). Частка «народных» аддзяленняў паступова акадэмізавалася і страціла кантакты з аўтэнтычным народным мастацтвам, частка – захавала непасрэдную сувязь з мастацкай аўтэнтыкай свайго народа. Наколькі жыццястойкім будзе вынік этнамастацкай адукацыі ў Еўразіі, пакажа рэчаіснасць XXI стагоддзя.


ЛІТАРАТУРА

1. *Дарашэвіч, Э.* Тэорыя фальклору: вучэб.-метад. дапам. / Э. Дарашэвіч; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2016. – С. 45.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ